# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ

№ 17 (172) 11 чэрвеня 1991 года


СЛОВА ПРА ЛЕНІНСКАГА СТЫПЕНДЫЯТА

## ************************** КАЛІ

## ************************** ЁСЦЬ

## ************************** МЭТА



**На здымку: ленінскі стыпендыят, студэнт другога курса першай групы фізічнага факультэта Анатоль Януль.**

Амаль чатыры семестры за плячыма Анатоля Януля — другакурсніка фізічнага факультэта, а ў заліковай кніжцы адзнака толькі адной вартасці — «выдатна». Думаецца, што гэтым сказана многае. І таму Анатолю прызначана ленінская стыпендыя.

Звычайна, захапленне тым ці іншым прадметам пачынаецца яшчэ са школьных гадоў і потым прыводзіць да ўсвядомленага выбару будучай прафесіі. Так было і ў Анатоля.

Доўгіх разважанняў, куды пайсці вучыцца далей, у юнака не было. Фізіку выбраў пасля дзевятага класа. Калі вучыўся ў школе, адначасова займаўся ў фізіка-матэматычнай школе пры БДУ. Яму прысылалі кантрольныя заданні, а ён стараўся, выконваў іх. Займаўся таксама і ў «Школе Юнага Фізіка» пры ГрДзУ. У школу, дзе вучыўся Анатоль, з універсітэта прыязджалі выкладчыкі, чыталі лекцыі, змест якіх быў і цікавым, і займальным, але адначасова ён насіў і агітуючы характар. Канчатковы выбар прафесіі быў зроблены ў час збораў удзельнікаў завочнай школы.

Ваўкавыскую СШ № 5 скончыў з залатым медалём. Экзамен па фізіцы ў яго прымаў сам дэкан фізічнага факультэта Гродзенскага універсітэта Аляксандр Макаравіч Каладзінскі. Анатоль атрымаў адзнаку «выдатна». Гэта ж адзнака стала ў экзаменацыйным лісце пры паступленні ва універсітэт, дзе ён вырашыў далей набываць і ўдасканальваць веды па фізіцы.

Як дасягаецца поспех у вучобе! Анатоль адказаў на гэта пытанне без доўгіх развагі. Ен не лічыць, што старанныя адносіны да вучобы — гэта заслуга студэнта. Гэта — неабходнасць, без якой нельга стаць спецыялістам, адпавядаючым патрабаванням сённяшняга дня. Многія студэнты лічаць, што можна абысціся без наведвання лекцый, тым больш, што цяпер яно з ´яўляецца неабавязковым. Анатоль Януль прытрымліваецца іншага меркавання. Яму, напрыклад, грунтоўная лекцыя выкладчыка прыносіць значна большую карысць, чым акадэмічны падручнік, у якім не заўсёды можна разабрацца самому, ды і на падрыхтоўку патраціш больш часу. А ёсць і выкладчыкі, на лекцыі якіх хочацца ісці, заняткі якіх вылучаюцца высокім прафесіяналізмам і павагай да студэнтаў (гэта Анатоль лічыць адным з галоўных у адносінах паміж студэнтам і выкладчыкам).

У многіх, на жаль, аб выдатніках вучобы складваецца ўражанне, быццам бы яны за вучобай не заўважаюць усіх лепшых бакоў студэнцкага жыцця, пераўтвараюць яе ў самамэту. Такія людзі кажуць: «І навошта ім гэта! Сёння ж усім стыпендыю плацяць, абы сесіі здаваў «без хвастоў». Але для Януля толькі выдатнае валоданне ведамі па выбранай спецыяльнасці не перашкаджае яму быць і цікавым чалавекам, субяседнікам. Мае шмат сяброў, для якіх слова «ленінскі стыпендыят» не засланяе простага — «сябар». Радуе яго і тое, што яго не вылучаюць сярод іншых і выкладчыкі. На экзаменах да яго такія ж патрабаванні як і да іншых студэнтаў, можа нават і большыя. Зараз ідзе сесія і Анатоль ужо здаў два экзамены: англійскую мову і метады матэматычнай фізікі, па якіх таксама — «выдатна». Экзаменацыйная сесія для яго — гэта адказны перыяд. Але галоўнае — не баяцца, а спадзявацца на свае веды. Білет бярэ той, які «на яго гляне». Як і іншыя, ён лічыць, што экзамен — гэта латарэя, але вялікую ролю іграюць і веды, бо толькі з трывалымі прафесіянальнымі ведамі можна дабіцца мэты.

Адзін з яго любімых заняткаў — гэта музыка. Паспрабаваў ён і «будатрадаўскай кашы», і студэнцкай бульбы.

Калі ў чалавека ёсць мэта, ён ідзе да яе ўпэўнена, не баючыся цяжкасцей, бо знаходзіць у сабе сілы на іх пераадольванне. А мэта ў Анатоля — стаць спецыялістам-фізікам. Можна не сумнявацца, што ён яе дасягне.

**Г. КАМЕНЕВА.**

## *АДКРЫТЫ ЛІСТ*
### *ДЭКАНУ ФАКУЛЬТЭТА БЕЛАРУСКАЙ ФІЛАЛОГІІ І КУЛЬТУРЫ ІГАРУ ЖУКУ*

*Паважаны Ігар Васільевіч!*

*Не так даўно савет Вашага факультэта на сваім закрытым пасяджэнні разгледзеў і зацвердзіў вучэбны план. Нельга не заўважыць, што па сваіх асноўных паказчыках гэта даволі грунтоўны дакумент, на аснове якога можна будзе рыхтаваць выкладчыкаў беларускай мовы, літаратуры і культуры. Але ёсць у ім хібы, на якія я хачу звярнуць увагу.*

*Не вытрымлівае крытыкі сам падыход да арганізацыі навучання на першых трох курсах. Нядоўга думаючы разам з трыма вельмі паважанымі мною прафесарамі і некалькімі дацэнтамі, Вы зрабілі вучэбны план без практычнай накіраванасці. Не маргнуўшы вокам, Вы выкраслілі аж два віды практык — бесперапынную на I—III курсах і практыку ў загарадным лагеры пасля III курса, такім чынам, у лепшых традыцыях царкоўнікаў прайшоўшых эпох, адлучылі будучых студэнтаў ад школы. Што ж, можа ў школах горада і вобласці для гэтых маладых асоб ужо няма работы? Гэта, вядома, не так важна ўжо на факультэце давузаўскай падрыхтоўкі, абітурыентаў трэба далучаць да прапаганды роднай мовы і культуры, знаёміць з нацыянальнымі традыцыямі і г. д.*

*На I — III курсах у ходзе практыкі і пасля заняткаў па грамадскіх асновах студэнты абавязаны падтрымаць вучняў і бацькоў тых класаў, дзе ідзе выкладанне на беларускай мове, стварыць гурткі мовазнаўцаў, рыхтаваць вечары, святы, праводзіць экскурсіі і г. д. Можа тады не будзе абуральнага для мяне — беларуса — становішча, калі ў г. Гродна менш, чым два гады назад ва ўсіх першых класах на беларускай мове вучыўся... аж адзін вучань!? А Вы збіраецеся запіхнуць студэнтаў у нашы непрыглядныя аўдыторыі, і бясконца — тры гады — фаршыраваць тэарэтычнымі ведамі.*

*Дарэчы, ужо ў гэтым годзе ў Мінску завяршыўся збор сродкаў на адкрыццё ў Мінскай вобласці першага ў рэспубліцы беларускамоўнага дзіцячага загараднага лагера «Грунвальд». Супрацоўнікі кафедры педагогікі разлічвалі на тое, што з дапамогай выкладчыкаў і студэнтаў Вашага факультэта і ў Гродзенскай вобласці будуць створаны такія цэнтры, у якія на работу былі б запрошаны настаўнікі — самацветы, такія, напрыклад, як Алесь Белакоз з Гудзевіч. Можа і вам можна было б адарвацца ад дэканацкіх папер, каб пасядзець ля лагернага агню. А Вы зацвердзілі практыку «факультатыўнай», зрабіўшы «вялікі ўклад» у вузаўскую дыдактыку.*

*Адным словам, ад эпохі застою Вы добра засвоілі галоўны лозунг педагогікі таго часу — студэнтам і вучням, не трэба даваць жыць у школе і ВНУ, а трэба рыхтаваць, рыхтаваць, рыхтаваць і г. д. да запраграміраванага бяздумнага жыцця.*

*Хацелася б, каб добрай традыцыяй Вашага факультэта стала запрашэнне агульнауніверсітэцкіх кафедр на пасяджэнні савета, каб заслухаць іх аргументы. На жаль, у гэтым годзе на дэканацкіх канапах ім не хапіла месца.*

*Дзякуй за ўвагу!*

**В. ТАРАНЦЕЙ,**
**загадчык кафедры педагогікі, прафесар.**

## ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ: ГРАНІ АБНАЎЛЕННЯ

*Чым павінна займацца партыйная арганізацыя? Якое яе месца ў сучасным бурлівым грамадска-палітычным жыцці? Гэтае пытанне хвалюе многіх камуністаў. Адказаць адназначна цяжка. Час дыктуе нам: не зыходзіць на збочыну, заставацца прынцыповымі ў вырашэнні ўсіх Якія б віхуры не праносіліся, важна захаваць прыверджанасць сацыялістычнаму выбару, нашым рэвалюцыйным, баявым, працоўным традыцыям. Бо ў іх захоўваецца вялікі патэнцыял духоўнасці, высокай грамадзянскасці, агульначалавечых каштоўнасцей. Ігнараваць гэта, бяз-*

*Сёння партыйны камітэт заяўляе аб сваёй пазіцыі ў сувязі з тым, што 12 чэрвеня ў Ленінградзе плануецца правесці рэферэндум аб перайменаванні горада ў Санкт-Пецярбург.*

**Паважаныя таварышы!**

*Са здзіўленнем і глыбокім хваляваннем даведаліся мы і ўспрынялі вестку аб рэферэндуме, які*

## *НАША ПАЗІЦЫЯ*

*Няве.*

*Лічым сваім абавязкам заявіць, што бачым у гэтай акцыі чарговую спробу перапісаць нашу гісторыю, зняславіць імя і справы Уладзіміра Ільіча Леніна, створаную ім партыю камуністаў, гістарычную непазбежнасць Вялікага Кастрычніка, сутнасць Савецкай улады.*

*Змена назвы горада з ´явілася б знявагай памяці загінуўшых і лепшых рэвалюцыі, абаронцаў горада ў гады грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, разбурэннем маральнага ідэалу нашага грамадства, мела б негатыўныя вынікі не толькі для справы перабудовы ў СССР, але і нанесла б непапраўны ўрон аўтарытэту нашай дзяржавы ў сусветным грамадстве.*

*Звяртаемся да вас, да ўсіх камуністаў, усіх ленінградцаў папярэдзіць памылку, якая рыхтуецца, абараніць сённяшняе імя*

# Да 100-годдзя з дня нараджэння М. А. Булгакава

## ПА СЛЯДАХ РАМАНА

Лёс літаратурнай спадчыны М.А.Булгакава — гістарычны сюжэт рэдкага драматызму. Гэта смутны лёс вялікага таленту, які шукаў справядлівага прызнання.

Яшчэ зусім нядаўна Булгакаў быў добра вядомы і блізкі параўнальна невялікаму колу спецыялістаў-літаратуразнаўцаў, знатакам тэатра 30-х гадоў, асобным дапытлівым чытачам. Зараз жа Булгакаў аднесены да класікаў савецкай літаратуры, у меркаваннях пра яго зараз гучаць зусім іншыя, чым раней, інтанацыі, іншая эмацыянальная прыналежнасць чытачоў да яго вельмі індывідуальнага вопыту.

Усё гэта адлюстроўвае перамены ў нашай свядомасці, якія з'яўляюцца вынікамі грамадскіх зрухаў у апошнія гады. Найбольш відавочна гэтыя змены адбіліся на лёсе булгакаўскага рамана «Майстар і Маргарыта».

Гэту кнігу пісьменнік ствараў, і быў упэўнены, што публікацыя яе пры жыцці немагчыма. Зараз раман, які выйшаў у свет больш, чым чвэрць стагоддзя пасля яго напісання, вядомы ўсяму чытаючаму свету. Чынгіз Айтматаў паставіў гэты раман побач з «Ціхім Донам» М.Шолахава, размежаваўшы іх па ступені даступнасці шырокаму колу чытачоў і ўказаўшы на элітарную прызначанасць булгакаўскага тварэння.

Апошняе справядліва. Аднак, не трэба лічыць «Майстра і Маргарыту» раманам для выбраных. Бясспрэчна, што поўнае разуменне яго магчыма пры ўмове высокай агульнакультурнай падрыхтаванасці і гістарычнай дасведчанасці. Але феномен успрыняцця рамана ў тым, што «Майстра...» чытаюць і маладыя. Мабыць, справа тут ў казачна-фантастычным каларыце апавядання, якое блізка нават дзіцячай свядомасці, якая не здольна многае зразумець, але можа многае прыняць у любым незвычайным творы. І гэта асабліва важна: галоўнае, каб сцэны з лятаючымі на палавой шчотцы і парсюку жанчынамі і катом, які ўмее гаварыць, не адштурхнулі чытача, а разуменне мастацкіх умоўнасцей ўсё роўна з'явіцца. Гэта агаворка неабходна таму, што яшчэ ёсць сведчанні непрыняцця рамана Булгакава менавіта па прычыне яго выключнай сюжэтнай мудрагелістасці, знешняй непраўдападобнасці сітуацый і дэталяў.

Многім чытачам расказ аб адным дні рымскага пракуратара можа здацца самым уразлівым у «Майстры і Маргарыце». Але не трэба ўспрымаць гэта апавяданне як устаўную навэлу. Уся таямніца кампазіцыі рамана — у звязваючых ніцях паміж далёкім мінулым і цяперашнім днём. Антытэза дабра і зла — вось галоўная агульнасць непадобных, як здаецца, сюжэтаў.Спор рымскага пракуратара Іудэі і бадзяжнага прапаведніка наконт таго, ці будзе царства ісціны, часам знаходзіць калі не роўнасць, то нейкае незразумелае інтэлектуальнае падабенства карніка і ахвяры. Нават здаецца, што першы не зробіць злачынства над безабаронным упартым. Вобраз Пілата дэманструе ўнутраную барацьбу асобы, і таму ён пасвойму драматычны. Але ў чалавеку сутыкаюцца няроўныя пачаткі: асабістая воля і ўлада абставін. Іешуа духоўна перамог апошнюю, Пілату гэта не дадзена. Як чалавек, ён не прымае і не падтрымлівае смяротнай кары, але ў якасці пракуратара яе зацвярджае. Іешуа сам выносіць сабе прыгавор, адкрыўшы Пілату сваю дзёрзкую ўтопію: прыйдзе канец кесаравай уладзе.

Гісторыя Понцiя Пілата і Іешуа мае двайную сувязь з асноўнымі сюжэтнымі лініямі твора. Па-першае, яна складае змест таго рамана, які піша Майстар (менавіта лёс яго спаленага і аднаўленага рукапісу нарадзіў выказванне Валанда, якое стала крылатым: «Рукапісы не гараць»). Па-другое, гэта страшная гісторыя завяршаецца ў галоўным тэксце кнігі. Здавалася б, якая яшчэ патрэбна канцоўка: Іешуа пакараны. Але аўтар сцвярджае, што перамога зла над дабром не можа стаць канчатковым вынікам маральнага проціборства. Гэтага, са слоў Булгакава, не прымае сама чалавечая прырода. І гэта даказваюць учынкі самога рымскага пракуратара. Менавіта ён асудзіў на смерць няшчаснага вандроўніка, загадаў тайна пакараць Іуду, які здрадзіў Іешуа. У д'ябальскім хаваецца чалавечае і здзяйсняе, няхай і баязліва, помсту за здраду.

Зараз, праз многія стагоддзі, носьбіты зла, каб канчаткова выкупіць сваю віну перад вечнымі вандроўнікамі, якія заўсёды ішлі на агонь за свае ідэі, абавязаны стаць тварцамі дабра і справядлівасці.

Так з'явіўся ў «Майстры і Маргарыце» Валанд, вобраз якога адразу ж растлумачаны словамі з «Фауста» Гётэ, якія пастаўлены ў эпіграф да рамана:«Я—часть той силы, что вечно хочет зла и вечно совершает благо». Гэта метафара чалавечай супярэчнасці, вырашэнне якой, са слоў Булгакава, павінна зацвердзіць справядлівасць.

Усё дрэннае ў маскоўскай мітусні чыноўнікаў, паўінтэлігентаў, якіх карыкатурна паказвае раманіст, пераносіць на сабе разбуральныя ўдары Валанда. Свет паўстае тут быццам перавернуты: амаль немагчыма сказаць, дзе тут сапраўдная д'яблаліяда — у літаратурным асяроддзі ці ў асяроддзі д'ябла і яго світы.

Але чаму ж менавіта Валанду дадзена права караць і мілаваць! Магчыма, гэта самавыкрыццё зла. Валанд назірае за булгакаўскай Масквой як даследчык, які ставіць навуковы вопыт, быццам ён і сапраўды пасланы ў камандзіроўку ад нябеснай канцылярыі. Тым, хто аслаб душой і засумняваўся ў сіле кахання, Булгакаў усяляе надзею і заклікае: «За мной, мой чытач, і я пакажу табе такое каханне!» І вось над мізэрнымі жаданнямі, хітрасцямі, мітуснёй Масаліта, кабінетаў Акустычнай камісіі і апартаментаў дамкама Босых узлятае жывое рамантычнае пачуццё. Прарэзваючы стракаты натоўп і тушачы шумлівы фон бытавых своекарыслівых галасоў, узнікае, набірае сілу і перамагае вялікае чалавечае пачуццё Майстра і Маргарыты. Булгакаў сцвярджае веру сярод бязвер'я, справу сярод гультайства, каханне сярод нянавісці, мастацтва ў свеце славалюбства.

**М.БРЫЧОВА,**
**студэнтка 4 курса 2 групы філалагічнага факультэта.**

*15 мая — знамянальная дата для аматараў літаратуры. Гэта свята ўсіх, для каго мастацкае слова стала неад'емнай часткай сумнення, найважнейшым духоўным патрабаваннем. Сто гадоў назад у сям'і дацэнта Кіеўскай духоўнай акадэміі нарадзіўся хлопчык, якому быў наканаваны слаўны і драматычны лёс рускага пісьменніка — Міхаіл Булгакаў...*

*Доўгім і цяжкім быў яго шлях да чытача. Аўтар «Майстра і Маргарыты», «Белай гвардыі», «Дзён Турбіных», шматлікіх сатырычных аповесцей і апавяданняў надоўга аказаўся выкрэсленым з літаратуры. Тым больш радаснае яго вяртанне. Сёння мы маем магчымасць далучыцца да свету яго герояў, настрояў, ідэй, адчуць, што ісціна непахісна.*



## «Я ІДУ ПА КРУТОЙ ДАРОЗЕ РЫЦАРСТВА»

**«Люди выбирают разные пути. Один, спотыкаясь, карабкается по дороге тщеславия, другой ползет по тропе унизительной лести, иные пробираются по дороге лицемерия и обмана. Иду ли я по одной из этих дорог! Нет! Я иду по крутой дороге рыцарства и презираю земные блага, но не честь».**

**М. Булгакаў «Дон Кіхот»**

*З імем М. Булгакава ва ўяўленні паўстае вобраз генія, які згубіўся ў часе, незразумелага, не прызнанага і забытага. Але ж такая штука жыццё... Яно заўсёды ўсё ставіць на свае месцы.*

*Нам не цяжка зразумець, чаму пісьменнікам пагарджалі ў нашай краіне. Перш за ўсё ён бачыў рэзкую палярызацыю ў культуры: «Лучшие перья в России», пишущие фельетоны против большевиков («Белая гвардия»); большевиков, разрушающих «буржуазное» искусство и командными методами пытающихся создать новое («Записки на манжетах»); агрессивную породу московских литераторов («Театральный роман», «Мастер и Маргарита»); обострение классовой борьбы» в искусстве, подкрепляемое то и дело раздирающимися категорическими заключениями, что «в наше время гениален только коммунизм и им объявленное», а все «остальное в Европе бездарно и непроходимо бонально».*

*У сваім пісьме, якое было напісана ў 1930 годзе, пісьменнік адхіліў спробы прадставіць яго пасквілянтам Вялікай Рэвалюцыі, чэсна гаварыў, што аддае перавагу Вялікай Эвалюцыі, мернаму і паступоваму ходу развіцця. М. Булгакаў, выхаваны ў інтэлігентнай сям'і, дзе вельмі паважалі і цанілі як бацьку, чалавека справядлівага, цярпімага і аб'ектыўнага, так і маці. Лепшым слоем у грамадстве называў рускую інтэлігенцыю. І ўсё гэта як раз у разгар «раскулачвання» ў вёсцы, ганення і праследавання ўсіх «светлых думак». Гэты чалавек, ганаровы і чэсны, не пабаяўся сказаць слоў «супраць», якія сталі для яго ракавымі. І як вынік — доўгае забыццё. Аднак, «рукапісы не гараць». Пасмяротны лёс Булгакава пацвердзіў гэты афарызм-прадказанне.*

*Сачыняць Міхаіл Афанасьевіч стаў, як сведчаць блізкія, вельмі рана. Атрымаўшы прафесію ўрача, працаваў у земскай бальніцы на Смаленшчыне, затым трапіў у белагвардзейскую армію, дзе быў лекарам. Усё гэта, зразумела, не задавальняла маладога чалавека. У 1921 годзе ён прыязджае ў Маскву, дзе трэба было зноў пачынаць ўсё спачатку. Перш, чым стаць маскоўскім журналістам, Булгакаву давялося папрацаваць канферансье, рэдактарам хронікі, займаць пасаду інжынера. Сачыняў нарысы для «Накануне», у якіх малады аўтар мог «разгарнуць свае думкі», і гэта работа была для яго вельмі сур'ёзнай. Тыя далёкія «Мамзель Жанна», «Говорящая собака»,якія аукнуцца ў «Майстры і Маргарыце», «Записках покойника», перанясуць у іх, толькі ў ачышчаным выглядзе, тое ўражанне, ілюзію рэпартажа з месца, уяўную імправізаванасць фельетона. Такім можна лічыць амаль біяграфічны твор «Запіскі на манжэтах».*

*У сваім першым буйным творы, рамане «Белая гвардзія», М. Булгакаў заявіў пра сябе як пра пісьменніка класічнай велічыні і па маштабу, і па сталасці таленту. Адным з першых, хто разгледзеў яго талент, быў М. Валошын. Ён гаварыў: «Гэта душа рускай усобіцы». На старонках яго кнігі ваююць белыя з пятлюраўцамі. Але пісьменніка хвалюе больш шырокая ізмалістычная мэта — паказаць жах братазабойніцкай вайны. Булгакаў абараняе ў рамане вечныя каштоўнасці — дом, радзіму, сям'ю. Гэтыя матывы атрымліваюць развіццё і ў п'есе «Дні Турбіных», якая мела вялікі поспех і назаўсёды стала візітнай карткай Булгакава-драматурга. У п'есе з'явілася нота спачування да інтарэсаў народа. Лінія Мышлаеўскага акрэслівалася як шлях у лагер бальшавікоў, а Аляксей Турбін гіне ў знак трагічнай вычарпальнасці белага руху.*

*У апошні раман «Майстар і Маргарыта» мы ідзем па каменна-халодных, адчужана-цудоўных радках-прыступках, абдуваемых ледзяным агнём д'ябальскага гонару гётэўскага Мефістофеля.*

*— Я — часть той силы, что вечно хочет зла и вечно совершает благо.*

*Рука Майстра Булгакава натхнёна, адным узмахам пэндзля, намалявала змрочна-цудоўную, трывожна-глухую карціну аддалення д'ябальскай кавалькады, якая чацвёра сутак гастралявала ў Маскве з місіяй дабра і цяпер пакідала грэшнае зямное жыццё.*

*Як і кожны вялікі пісьменнік, Булгакаў стварае свой свет. Гэты свет асвятляе не ўсю рэчаіснасць, а толькі частку яе, уражанне ад якой застаецца на ўсё жыццё. І амаль усё створанае пісьменнікам — гэта непрымірымае адмаўленне сапсаванай рэчаіснасці, той, якая ўвайшла ў яго творы, той, па якой пранёсся д'ябальскі шабаш («Роковые яйца», «Собачье сердце»). Толькі пасля з'яўляецца другое «я» Булгакава, якое адлюстравана ў рамане «Майстар і Маргарыта», дзе д'яблы, што кружылі маленькага чалавека, пераўтварыліся ў «силу, зла только хотевшую, но творившую добро».*

*Вось такі ён — М. А. Булгакаў, чалавек, «презирающий земные блага, но не честь».*

**І. ЯНЧ,**
**студэнтка 4 курса 2 групы філалагічнага факультэта.**

## *ЖЫЦЦЁ І ЛЁС М. БУЛГАКАВА*

**(рэцэнзія на кнігу М. Чудаковай «Жизнеописание Михаила Булгакова»)**

Вялікая работа была зроблена многімі даследчыкамі па вывучэнню жыцця і творчасці М. Булгакава. Для вывучэння каўказскага перыяду жыцця пісьменніка шмат зрабіў заўчасна загінуўшы Д. Гірэеў, аўтар кнігі «Михаил Булгаков на берегах Терека»(1980); шэраг цікавых момантаў высветлены ў кнізе Л. Яноўскай «Творчы шлях М. Булгакава» (1983); гісторыю адносін паміж пісьменнікам і МХАТам расказаў А. Смелянскі ў кнізе «Михаил Булгаков в Художественном театре» (1986), не кажучы ўжо пра вялікі пласт часопісна-газетных публікацый.

Для біяграфіі Булгакава Чудакова зрабіла тое, што П. В. Аненкоў зрабіў для біяграфіі Пушкіна.

Расказ аб творчасці аддзелены ад жыцця для того, каб паказаць іх непадзельнасць.

З таго часу, калі выйшаў раман «Майстар і Маргарыта», у чытача ўзнікае пытанне аб суадносінах паміж раманам і верай. Перабіраючы факты, М. Чудакова асцярожна, але пераканана, дае адказ на гэта пытанне. Вядома, выхаванне ў сям'і выкладчыка духоўнай акадэміі пакінула свой след на ўяўленнях маладога Булгакава: захапленне прыродазнаўчымі навукамі, вывучэнне біялогіі і медыцыны зрабілі яго прыхільнікам пазітывізму і атэізму. Духоўныя пошукі пісьменніка прывялі яго да пабудовы маральнага абсалюта, той нормы, якая, як паказала М. Чудакова, складала аснову светаўспрыняцця Булгакава. Канчатковага адказу на пытанне аб рэлігійнасці Булгакава Чудакова не дае і гэта, вядома, сведчанне інтэлектуальнай чэснасці даследчыка. Вывады, адпаведныя існуючым фактам, робяць гэту кнігу творам нашага часу, які прагне праўды.

«Яго сучаснікі часта стараліся пагоршыць яго анкету, сённяшнія паклоннікі імкнуцца яе «палепшыць»,— іранічна заўважае М. Чудакова, але паклёпнікі — справа мінулая, яны абязброены ходам часу, і даследчыца бачыць сваіх галоўных апанентаў ва ўпрыгожвальніках. Спробы падчысціць біяграфію пісьменніка і запэўніць, што ў ёй усё ў парадку (асабліва ў ідэалогіі), мелі карысную мэту — хутчэй вярнуць Булгакава ў літаратуру, але, уліваліся, няхай і з другога боку, у сістэму падману. М. Чудакова разглядае, здавалася б, самыя рызыкоўныя сюжэты біяграфіі і погляды пісьменніка, каб знайсці праўду, зразумела, у той меры, на колькі факты дазваляюць аб ёй меркаваць.

Кніга з'явілася выніковай для айчыннага булгаказнаўства, але яна прынцыпіяльна «не закончана» — г. зн. адкрыта для даследчыкаў.

**В. ШЫМУЛЬ,**
**студэнтка 4 курса 2 групы філалагічнага факультэта.**

